**Ірына ЖЫТКО,**
**загадчык кафедры методык дашкольнага выхавання,**

**Дзіна ДУБІНІНА,**
**дацэнт кафедры методык дашкольнага выхавання (БДПУ імя М. Танка)**

***Больш за трыццаць гадоў развіццё дашкольнай адукацыі ў краіне звязана з імем Н.С. Старжынскай, першым і адзіным на сённяшні дзень доктарам педагагічных навук Рэспублікі Беларусь па спецыяльнасці «Тэорыя і методыка дашкольнай адукацыі», прафесара кафедры методык дашкольнага выхавання БДПУ імя М. Танка, члена Міжнароднай асацыяцыі даследчыкаў дзіцячага маўлення (ЗША). Вызначальнае месца ў яе даследаваннях і педагагічнай дзейнасці займаюць праблемы маўленчага развіцця дзяцей дашкольнага ўзросту. У навуковую і метадычную скарбонку краіны ўвайшло больш за 100 прац даследчыцы.***

# ДАСЛЕДЧЫК ДЗІЦЯЧАГА МАЎЛЕННЯ


**На здымку: Н.С. Старжынская (у цэнтры) сярод калег па працы.**

Як асоба і высокакваліфікаваны спецыяліст Наталля Сцяпанаўна сфарміравалася пад уплывам акружаючых яе людзей — бацькоў, настаўнікаў, калег. Выпускніца аддзялення педагогікі і методыкі пачатковага навучання (1971 г.) педагагічнага факультэта МДПІ імя М. Горкага, яна ў 1974 годзе паступае ў аспірантуру НДІ дашкольнага выхавання АНП РСФСР (лабараторыя падрыхтоўкі дзяцей да школы). Навуковыя інтарэсы, светапогляд Наталлі Сцяпанаўны, якія склаліся пад кіраўніцтвам таленавітых настаўнікаў Л.Я. Журавай, М.М. Паддзякава, Д.Б. Эльконіна, праявіліся ў кандыдацкай дысертацыі «Обучение дошкольников элементам орфографии на занятиях по грамоте» (1979, навуковы кіраўнік Л.Я. Журава), у шэрагу навучальных і навучальна-метадычных дапаможнікаў: «Подготовка к обучению грамоте» (1982), «Дидактические игры на занятиях по обучению грамоте в детском саду» (1982), «Навучанне дашкольнікаў роднай мове» (1985), «Обучение первоклассников связному чтению» (1986), «Займальны матэрыял па навучанню грамаце» (1989), «Беларуская грамата ў дзіцячым садзе» (1993), «Обучение грамоте в детском саду» (2000) і інш. Усе яны прысвечаны праблемам навучання дзяцей роднай мове, фарміравання ў іх элементарнага асэнсавання з'яў мовы і маўлення.

У рэчышчы навучання грамаце па методыцы Д.Б. Эльконіна, Л.Я. Журавай яна праводзіць даследаванні па навучанні дашкольнікаў элементам арфаграфіі і звязнаму чытанню. Вызначыўшы ўменні, неабходныя для авалодання сінтэтычным чытаннем, Н.С. Старжынская ўмоўна вылучае ступені навучання дзяцей шасці гадоў пачатковаму звязнаму чытанню: выпрацоўка ўвагі да граматычных прыкмет слова і іх ролі ў сувязі слоў у сказе; навучанне прагназіраванню пры чытанні; навучанне звязнаму чытанню:

- *выпрацоўка ўвагі да граматычных прыкмет слова і іх ролі ў сувязі слоў у сказе;*
- *навучанне прагназіраванню пры чытанні;*
- *навучанне звязнаму чытанню слова;*
- *навучанне выдзяленню і злітнаму чытанню фанетычнага слова;*
- *аб'яднанне слоў у словазлучэнні, счытванне іх без паўторнага прачытвання;*
- *актуальнае чляненне сказа і наступнае яго выразнае чытанне з адпаведнай інтанацыяй канца сказа.*

Пасля навучання ў аспірантуры Наталля Сцяпанаўна працуе ў НДІ педагогікі БССР (1977–1989) спачатку навуковым супрацоўнікам, а потым загадчыцай лабараторыі дашкольнага выхавання (1979–1989). У гэты час навуковыя інтарэсы звязваюць Н.С. Старжынскую з такімі вучонымі і даследчыкамі дзіцячага маўлення, як Ф.А. Сахін, А.С. Ушакова, А.М. Богуш, К.Ю. Пратасава, Т.М. Савельева, С.Н. Цэйтлін і інш. Разам з даследчыцкай дзейнасцю яна вядзе вялікую навуковую работу, выступае ў якасці рэцэнзента, апанента, кансультуе аспірантаў, маладых вучоных, кіруе іх даследаваннямі.

Ей уласцівы высокая грамадзянскасць, прынцыповасць, адданасць сваёй справе, высокі прафесіяналізм, зацікаўленасць працай.

З 1989 года Н.С. Старжынская працуе ў Мінскім дзяржаўным педагагічным інстытуце імя М. Горкага. Яна ўдала спалучае навуковую работу з навучальнай. У дапамогу студэнтам ёю створаны навучальныя дапаможнікі: «Уводзіны ў методыку развіцця маўлення» (1991), «Методыка развіцця роднага маўлення» (1998), праграмы практычных і лабараторных заняткаў па курсе «Тэорыя і методыка развіцця маўлення».

Наталля Сцяпанаўна — бліскучы педагог. Яе лекцыі вылучаюцца глыбінёй, выкарыстаннем цікавых прыкладаў, веданнем дзяцей і прыёмаў работы з імі. Зместам лекцый былі зацікаўлены студэнты вышэйшых навучальных устаноў Беларусі, Польшчы, Балгарыі.

З 1998 па 2001 гг. Н.С. Старжынская — загадчык кафедры методык дашкольнага выхавання. Пад яе кіраўніцтвам пачынаецца распрацоўка базавых і тыпавых праграм па методыках дашкольнага выхавання.

Выказаныя Наталляй Сцяпанаўнай навуковыя ідэі, думкі, меркаванні аб асаблівасцях маўленчага развіцця дзяцей, змесце, метадах развіцця маўлення і навучання роднай мове атрымалі сваё развіццё ў працах яе вучняў — маладых вучоных А.І. Мельнік, Дз.М. Дубінінай.

Для навуковых работ Н.С. Старжынскай характэрны глыбіня пастаноўкі і вывучэння пытанняў, іх псіхалагічная абгрунтаванасць. Наталля Сцяпа-

наўна з'яўляецца аўтарам раздзела «Становление речи у дошкольников» у падручніку «Детская психология» пад рэдакцыяй Я.Л. Каламінскага, Л.А. Панько (1988). Ёй належыць распрацоўка канцэпцыі маўленчага развіцця і навучання роднай мове ў Рэспубліцы Беларусь.

Наталля Сцяпанаўна вызначае тэарэтычныя і метадычныя асновы развіцця беларускага маўлення і навучання рускамоўных дзяцей дашкольнага ўзросту беларускай мове як роднай. Яна ўпершыню паказала асаблівасці руска-беларускага двухмоўя, сфармулявала мэты навучання дашкольнікаў беларускай мове як роднай, пабудавала інструментальную мадэль навучання дашкольнікаў беларускай мове ў дзіцячым садзе. Распрацаваныя падыходы да развіцця маўлення і маўленчых зносін дзяцей пакладзены ў аснову адпаведных раздзелаў нацыянальнай праграмы выхавання і навучання дзяцей у яслях-садзе «Пралеска», «Программы воспитания и обучения детей 6-го года жизни, не посещающих дошкольные учреждения», праграмы «Воспитание и обучение детей 7-го года жизни в дошкольном учреждении», дзяржаўнага стандарту «Дошкольное образование. Готовность к школе. Специальная готовность.»

Матэрыялы даследавання праблем моўнага развіцця ў сітуацыі блізкароднаснага білінгвізму адлюстраваны ў навучальных і метадычных дапаможніках: «Беларуская мова ў дзіцячым садзе» (1995), «Тэарэтычныя асновы развіцця беларускага маўлення і навучання роднай мове дашкольнікаў» (1997), «Тэорыя і методыка развіцця беларускага маўлення дашкольнікаў» (2000), шырока выкарыстоўваюцца ў тэорыі і практыцы дашкольнай адукацыі. Доктарская дысертацыя Н.С. Старжынскай «Асновы развіцця беларускага маўлення і навучання роднай мове дашкольнікаў» (1998) абагульняе вынікі выкананых ёю і яе вучнямі шматгадовых даследаванняў, прысвечаных вызначэнню шляхоў фарміравання камунікатыўных якасцей беларускага маўлення. На гэтай аснове ёю распрацаваны комплекс іерархічна арганізаваных камунікатыўных дыдактычных гульняў і практыкаванняў, падабраны займальны матэрыял, беларускія народныя гульні, якія ўключаны ў метадычныя і навучальна-метадычныя дапаможнікі і выкарыстоўваюцца ў працэсе навучання беларускай мове ў дзіцячых садах рэспублікі. У дашкольных установах краіны паспяхова ўкараняецца яе аўтарская тэхналогія працэсу моўнага і лінгвістычнага развіцця дашкольнікаў у сітуацыі блізкароднаснага білінгвізму.

Наталля Сцяпанаўна святкуе свой юбілей. Яна — паважлівая паслухмяная дачка, добрая і клапатлівая маці, прывабная, сціплая і пяшчотная жанчына, любімая жонка, спагадлівы, вытрыманы, паважаны, вельмі дастойны чалавек.

Калегі з павагай шчыра віншуюць яе і жадаюць моцнага здароўя, удзячных вучняў, павагі сяброў, калег, міру і спакою ў доме, бадзёрага настрою, творчай працы, заўсёднай прыгажосці і гармоніі ў справах, думках і ўчынках.

* * *

Калектыў часопіса «Пралеска» далучаецца да гэтых цёплых віншаванняў. Няхай Вам, шаноўная Наталля Сцяпанаўна, заўсёды шчасціць ва ўсіх Вашых памкненнях і марах. Да новых сустрэч на старонках «Пралескі»!

## ВІНШУЕМ!



***В жизни по-разному можно жить.***
***В горе можно. И в радости.***
***Вовремя есть. Вовремя пить.***
***Вовремя делать гадости.***
***А можно так: на рассвете встать***
***И, помышляя о чуде,***
***Рукой обожженное солнце достать.***
***И подарить его людям.***

**Сергей ОСТРОВОЙ**

# ЖИЗНЬ, ПОДАРЕННАЯ ЛЮДЯМ

Человек — воплощение целого мира, со своим взглядом на окружающее, людей, работу, землю, со своим пониманием добра и зла, со своей мечтой о сегодняшнем и завтрашнем дне. Прикоснуться к большой и богатой духовно личности, удивительному человеку, которым является Галина Петровна Безродная, — дело нашей чести.

34 года работы в системе образования – это показатель высокого профессионального мастерства и творческого самосовершенствования. Ее имя хорошо известно не только работникам дошкольных учреждений Рогачевского района, но и всей Гомельской области.

Сложности с выбором профессии у Галины Петровны никогда не было. С детства она мечтала стать воспитателем дошкольного учреждения. И мечта эта осуществилась. Ее трудовая биография — работа на должности воспитателя, методиста, заведующего детского сада, инспектора и методиста отдела образования Рогачевского райисполкома.

Ее успехи — это развитая система дошкольного образования района, это новые типы, виды и профили учреждений, это открытые экспериментальные площадки и специализированные группы, это комплекс дополнительных услуг для воспитанников и их семей.

Ее радость и гордость — это многочисленные победы дошкольных учреждений в смотрах-конкурсах, высокое качество проводимых методических объединений, конференций, семинаров.

Галина Петровна — личность самодостаточная, поскольку она состоялась как в профессиональном плане, так и в главной роли на земле — роли женщины, матери. Она воспитала двух замечательных детей. Ее сын верно служит нашему Отечеству, работая в системе государственной безопасности. Ее дочь — студентка БГПУ им. М. Танка.

Галину Петровну характеризуют прекрасные организаторские способности, мудрость и деловитость в решении вопросов, чуткость и понимание к людям. Это верный и надежный друг, прекрасная хозяйка и мать, нежная и обаятельная женщина.

***Дорогая Галина Петровна!***
***С праздником Вас, с юбилеем!***
***Мы благодарны судьбе***
***за встречу с Вами.***
***Здоровья, благополучия и радости Вам!***

Сотрудники Гомельского государственного областного ИПК и ваши коллеги.